*Інфармацыя Аналітыка Публіцыстыка*

***№4 травень 2011***

# ПРЭЗУМПЦЫЯ

***Гарадзенскі праваабарончы інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***

**у нумары:**

**Шлях адзін ст. 4**



**у нумары:**

**Хроніка ст. 4 - 5**



**у нумары:**

**Тупік ст. 6**





**А кіраўніка ПЦ «Вясна» папярэджваюць пра крымінальную адказнасць**

**Праваабарончы Цэнтр «Вясна» адзначае сваё пятнаццацігоддзе**

***Праваабаронца Алесь Бяляцкі афіцыйна папярэджаны, што ў выпадку далейшай дзейнасьці будзе разгледжана пытаньне аб прыцягненьні яго да крымінальнай адказнасьці.***

***Генеральная пракуратура палічыла, што дзеяньні А. Бяляцкага ад імя праваабарончай арганізацыі “Вясна”, якая не прайшла ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнай рэгістрацыі, супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і 16 лютага 2011 г. вынесла яму афіцыйнае папярэджаньне. Такім чынам, праваабаронцу папросту забараняюць займацца сваімі непасрэднымі абавязкамі.***



Папярэджаньне Генеральнай пракуратуры старшыні Праваабарончага цэнтру “Вясна”, віцэ-прэзідэнту Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека (FIDH) Алесю Бяляцкаму будзе абскарджана у судзе Цэнтральнага раёна Менска 3 чэрвеня. Пачатак у 15-30. Суддзя Алена Сямак.

Рада Праваабарончага цэнтру “Вясна” выступіла з афіцыйнай заявай, у якой выказала рашучы пратэст з нагоды дзеяньняў Генеральнай пракуратуры і расцаніла гэта як спробу запалохваньня актывістаў арганізацыі і ўсяго праваабарончага руху Беларусі.

Аператыўна аб вынесеным папярэджаньні была праінфармаваная спецдакладчык ААН па пытаньні аб становішчы праваабаронцаў спадарыня Маргарэт Сэкагія, а шэраг міжнародных праваабарончых арганізацый запатрабавалі ад Генеральнай пракуратуры Беларусі адмены гэтага ганебнага рашэньня.

---



Гарадзенец Аляксей Салей, супрацоўнік часопісу “Magazyn Polski na uchodzstwie”, абвешчаны ў вышук. Напачатку году яго выклікалі ў КДБ з нагоды яго знаходжаньня на Плошчы ў Менску 19 сьнежня 2010 г, затым правялі домаператрус. На сайце Гарадзенскага абласнога УУС зьявілася інфармацыя: “Аддзелам унутраных справаў адміністрацыі Ленінскага раёну Горадні расшукваецца Аляксей Салей, які абвінавачваецца ў зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 343 Крымінальнага кодэксу РБ “. Трэба зазначыць, што на Плошчу ў Менск Аляксей Салей езьдзіў разам з Андрэем Пачобутам, перш за ўсё ў якасьці кіроўцы. Яму ўдалося пазьбегчы арышту і вярнуцца дахаты.

---



Старшыні ўправы Радыё Рацыя Яўгену Вапу пры перасячэнні польска-беларускай мяжы беларускія памежнікі анулявалі візу, не прапусціўшы такім чынам на тэрыторыю Беларусі, куды ён накіроўваўся па службовых справах.

Ад тлумачэння прычын такога рашэння беларускія памежнікі адмовіліся, сказаўшы толькі, што з гэтым пытаннем цяпер трэба звяртацца ў амбасаду Рэспублікі Беларусь у Польшчы.

- Гэта звязана з тым, што робіцца ў незалежнай інфармацыйнай прасторы і, - пракаментаваў здарэнне Яўген Вапа. - Бо не бачу іншых прычынаў адмаўлення ва ўездзе. Крыўдна, што духоўная Бацькаўшчына вось такім чынам глядзіць на беларусаў, якія жывуць па-за межамі Беларусі.

---



Стала ведама, што справа журналіста Андрэя Пачобута, якога вінавацяць у парушэнні адразу двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь – 368 – частка 1 (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) і 367 – частка 1 (паклёп на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) перададзеная суд. Такім чынам хадайніцтвы Пачобута і ягонага адваката Аляксандра Бірылава пра спыненне крымінальнай справы ў звязку з адсутнасцю складу злачынства адхілены. У бліжэйшы час высветліцца ў судзе якога раёну гораду – Кастрычніцкага ці Ленінскага будзе праходзіць працэс. Публіцысту Андрэю Пачобуту за ягоныя артыкулы ў інтэрнэце і польскай “Gazece Wzborczej” пагражае максімальна 4 гады турэмнага зняволення.

---

Праваабарончаму цэнтру “Вясна” у гэтым годзе спаўняецца пятнаццаць год з моманту утварэння. ПЦ “Вясна” увесь гэты час дзеїў на ніве абароны правоў чалавека. За сваю дзейнасць, сама арганізацыя і яе сябры ўвесь час падвяргаліся шматлікім пераследам.

Вось і напярэдні юбілею, цягам апошняга часу, міліцыя і КДБ правялі шэраг ператрусаў у цэнтры «Вясна» і канфіскавалі амаль усю тэхніку.

Кіраўнік праваабарончаму цэнтру “Вясна” Алесь Бяляцкі папярэджаны пра крымінальную адказнасць у выпадку працягу дзейнасці арганізацыі. Папярэджанне абскарджваецца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, паколькі праваабарончы цэнтр “Вясна” дзеіць выключна ў межах айчыннага заканадаўства і ўстаноўленых нормаў міжнароднага права.

ВЯСНА праваабарончы цэнтр

# Шлях адзін – гэта шлях Каліноўскага

«Ты не разумееш , галоўнае зараз – нават не сыход Лукашэнкі . Намнога важней падрыхтаваць грамадства. Нас вельмі доўга рабілі статкам, настолькі доўга, што гэта стала падавацца нормай».

Ізноў спрачаемся з Кіркевічам і крочым далей. У гарадзенскую ноч. Аздабляць гэты горад сымболікай і жыццесцвярджальнымі лозунгамі “Жыве Беларусь!”.

Рыхтаваць трывалы падмурак у грамадстве. Так нам тады падавалася. Быў травень 2010-га.

Пра яго зараз так многа пішуць . Але, па большасці сваей пафаснымі і наўмысна ўзнеслымі фразамі . .. Але! Гэта маладушна – успрымаць Кіркевіча праз прызму ідэалаў. Гэта маладушна і зняважліва .

А глядзець на яго праз краты вязьніцы - невыносна балюча.Найбольш балюча ад бездапаможнасці, ад таго, што звязаны рукі і яшчэ ад таго, што на яго юнацкую усмешку наклаў свой адбітак сталы сум, дый дарослая стомленасць. І так хочацца падзяліць з ім гэтую лаву падсудных, як некалі апошнія грошы на квіток у грамадскім транспарце.

Травень 2010. МФ-аўская філія на Гарадзеншчыне. Рабіць трэба было многа. А перш-наперш аб’ядноўваць моладзь. Кожны новы чалавек – змена страху і стэрэатыпнага мыслення. І крок да адраджэння. А людзі з’яўляліся. Праз некалькі месяцаў меліся быць выбары. І мы так наіўна верылі…

А мара, такая існая, натуральная і агульная, збіралася прыдбаць у цэлым рэальныя рысы. І тым не менш ,мы не выключалі з



варыянтаў і самы горшы. Неаднаразова пракручвалі сцэнарыі нашага будучага на выпадак траплення каго-небудзь у вязьніцу. Але сцвярджальным і бясспрэчным заўседы было адно – вялікая мэта патрабуе вялікіх ахвяраў . І нехта павінен гэта рабіць. Нехта… Як калісьці Кастусь Каліноўскі.

Імпэт Алеся ўражваў дый прымаушаў ацэньваць рэчаіснасць праз вясёлкавае шкло. ¨ н быў стоадсоткава упэўнены. Гэтае ўнутранае святло , якое нехта назаве нездаровым фанатызмам, вяло за сабаой і поўніла сэрцы спакоем. Алесь яшчэ не ведаў, хто выратуе Беларусь. ¨н спадзяваўся, што ўсё ж такі Бог. І менавіта аб бласлаўленні прасіў штодзённа прасіў.

Так, на судзе ен быў мужным, быццам унутры яго сталёвы стрыжань. Ен вымушаны быў БЫЦЬ МУЖНЫМ. У зале знаходзілася яго маці, якая падчас судовае цяганіны перанесла сардэчны інфаркт. У яго засталася жонка, дзеля якой ён нават на лаве падсудных павінен быць мужным абаронцам.

Ен глядзеў праз краты і ўсміхаўся нам. Алесь, Алесь… Нават турма яго не навучыла хлусіць. Ен глядзеў не сваімі вачыма, у іх ужо не было блішчыкаў шалеёнай маладосьці і нарысаў амбітнасці, вострай іроніі і фундаментальнай упэўненасці. Засталася толькі вера ў святое і , мне падалося, просьба да нябёсаў і лесу : каб нездарма.

За кратамі знаходзіцца не нейкі даўно вядомы герой, а проста юнак! У якога, аднак, хапіла пачуцця ўласнае годнасці зрабіць , на сённяшні дзень, сапраўдны подзвіг – не прагнуцца пад карніцкую сістэму і не прызнаць віны.

А наш Кіркевіч застаўся ў самым сэрцы гэтае вясны. Аб ёй ён шкадаваў на судзе. І пранясе гэты боль праз жыццё.

*Дамініка Калоша*

# Бясслаўны канец

Колькі б не цягнулася кожная дыктатура, яе непазбежна чакае бясслаўны і нават ганебны канец. Падзеі бягучага году ў Паўночнай Афрыцы і Заходняй Азіі толькі пацвярджаюць гэта. У гэтых рэгіёнах прыйшоў час краху таталітарных рэжымаў. Праходзіць ён вельмі хваравіта, часам з грамадзянскімі войнамі, як у Лібіі, часам з доўгім зацятым супрацьстаяннем. Да чаго прывядзе гэта трансфармацыя, сказаць цяжка – усё ж краіны арабскага свету маюць сваю спецыфіку і непрадказальнасць. Увогуле гаспадарчая, нацыянальная, канфесійная спадчына таталітарных рэжымаў вельмі незайздросная, выйсці з глыбіннага грамадскага крызісу пасля іх надзвычай цяжка і балесна.

Еўропа час вызвалення ад сваіх таталітарных рэжымаў – дыктатураў камунізму – прайшла раней і менш хваравіта. Нават адрэзаная ад знешняга свету Албанія спакваля выкараскалася на цывілізацыйны шлях, павылазіла з сваіх бетонных бункераў і бомбасховішчаў на святло. Прыйшлі змены і ў прыбалтыйскія краіны былога СССР. Шэраг краінаў усходняй Еўропы прайшлі праз шлях аксамітных рэвалюцый, якія можна назваць хутчэй эвалюцыямі. Найгорш выйшла ў Румыніі, калі Нікалае Чавушэску развязаў крывавую бойню ў Цімішаары. Загінула шмат жыхароў, а скончылася гэта тым, што кіраўніка мясцовай кампартыі з жонкай застрэлілі ледзь не бліжэйшыя паплечнікі.

Савецкія тыраны скончылі жыццё таксама бясслаўна. Стваральнік дыктатуры пралетарыяту Ленін доўга мучыўся, а перад смерцю практычна страціў розум і чалавечае аблічча,Сталін канаў у лужыне сваіх экскрэментаў, бо ніхто не адважваўся зайсці да яго ў пакой.

Дыктары розных часоў і народаў надзвычай падобныя паміж сабой. Усе яны пачынаюць аднолькава: прага неабмежаванай ўлады, ганаровай славы вядзе да ўзурпацыі і культу асобы, накаплення вялізных багаццяў у адных руках, потым ідзе мілітарызацыя дзяржавы, татальны пераслед грамадзянаў, здзекі і рэпрэсіі супраць іншадумцаў, забойствы апанентаў. Але прыходзіць час і чаша людскога і боскага цярпення перапаўняецца да краёў. Фальшывыя куміры сцягваюцца з п’едэсталаў, іх помнікі абрынаюцца ў пыл, нарабаваныя багацці адбіраюцца, а гісторыя выносіць свой справядлівы прысуд.

*Уладзімір Хільмановіч*

# Хроніка правапарушэнняў

*((( Гарадзеншчына, травень )))*

У сярэдзіне **траўня** гарадзенец **Аляксей Салей**, супрацоўнік часопісу “Magazyn Polski na uchodzstwie”, абвешчаны ў вышук. Напачатку году яго выклікалі ў КДБ з нагоды яго знаходжаньня на Плошчы ў Менску 19 сьнежня 2010 г, затым правялі домаператрус. На сайце Гарадзенскага абласнога УУС зьявілася інфармацыя: “Аддзелам унутраных справаў адміністрацыі Ленінскага раёну Горадні расшукваецца Аляксей Салей, які абвінавачваецца ў зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 343 Крымінальнага кодэксу РБ “Выраб і распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў альбо прадмэтаў парнаграфічнага характару з выявай непаўнагадовых”. 16 траўня Аляксей Салей зрабіў заяву наступнага зместу:

“**6 студзеня** я быў выкліканы на допыт у КГБ у сувязі з падзеямі ў Менску 19 снежня 2010 году, паколькі я быў там у гэты дзень і рабіў здымкі для часопісу “Magazyn Polski” і газеты “Glos z nad Niomna”. Следчых цікавіла што адбывалася на плошчы, што я бачыў і з кім ездзіў. Пасля таго, як яны даведаліся, што я ездзіў з Андрэем Пачобутам – іх больш зацікавіла гэтая асоба. Мне было прапанавана даць паказанні супраць яго, паколькі я быў фактычна заўсёды побач з Пачобутам. Калі ж я адмовіўся – сказалі, што будзе горш. Праз некаторы час у мяне дома адбыўся ператрус, пад час якога канфіскавалі кампутар і шмат нумароў згаданых вышэй выданняў. Праз некаторы час міліцыя распачала крымінальную справу на мяне за нібыта выраб і распаўсюд парнаграфіі. Такім чынам дзяржаўныя структуры хочуць дыскрэдытаваць маё імя. Я лічу, што гэта справа цалкам сфабрыкаваная, мае выразны палітычны падтэкст і з’яўляецца пераследам за прафесійную журналісцкую дзейнасць”.

**У ноч з 16 на 17 траўня** ў Гродне фарбаю для падлогі невядомымі злаўмыснікамі была залітая шыба аўтамабіля Ігара Банцара, галоўнага рэдактара польскамоўнага часопіса "Glos znad Niemna na uchodzstwie". Аўтамабіль Ігара Банцара быў запаркаваны каля аднога з дамоў па праспекце Будаўнікоў. З самай раніцы журналіст збіраўся заехаць па Аксану Пачобут, каб завесці яе на спатканне ў турме з мужам, іншым публіцыстам, Андрэем Пачобутам. Але выявілася, што



пярэдняе шкло аўтамабіля Банцара залітае чырвонай фарбай для падлогі. Было відавочна, што яго машына выбраная невыпадкова, паколькі іншыя аўтамабілі, што знаходзіліся побач не былі пашкоджаны. Ігар Банцар сцвярджае, што гэта не першы выпадак, калі такім чынам робіцца псаванне асабістага транспарту актывістаў непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў Беларусі напярэдадні нейкіх падзей ці важных справаў.

**18 траўня** хадайніцтвы Андрэя Пачобута і ягонага адваката Аляксандра Бірылава пра спыненне крымінальнай справы ў звязку з адсутнасцю складу злачынства адхілены.

**19 траўня** гарадзенскаму грамадскаму актывісту і праваабаронцу Віктару Сазонаву вярнулі кампутарную тэхніку і іншыя рэчы, забраныя пад час ператрусу 12 студзеня ў офісе па вуліцы Будзённага. Напярэдадні яму патэлефанавалі з Гарадзенскага ўпраўлення КДБ і прапанавалі забраць маёмасць. Супрацоўнік КДБ вярнуў усе рэчы, перапытаўшы пра значэнне некаторых з іх.

**22 траўня** крымінальную справу супраць журналіста Андрэя Пачобута перадалі ў Ленінскі раённы суд Гародні, па месцы яго жыхарства.

**23 траўня** старшыні ўправы Радыё Рацыя Яўгену Вапу пры перасячэнні польска-беларускай мяжы беларускія памежнікі анулявалі візу, не прапусціўшы такім чынам на тэрыторыю Беларусі, куды ён накіроўваўся па службовых справах.

Ад тлумачэння прычын такога рашэння беларускія памежнікі адмовіліся, сказаўшы толькі, што з гэтым пытаннем цяпер трэба звяртацца ў амбасаду Рэспублікі Беларусь у Польшчы.

**25 траўня** Гарадзенскі абласны суд адхіліў скаргу грамадска-палітычнага актывіста з Варнянаў Мікалая Уласевіча. Уласевіч намагаўся абскардзіць рашэнне Астравецкага раённага суду, які па-сутнасці адмовіў яму ў разглядзе скаргі на рашэнне Астравецкага райвыканкаму. Нагадаем, што “вертыкальныя” чыноўнікі ў красавіку бягучага году адмовілі актывісту ў правядзенні інфармацыйнага пікету пад назвай “Чарнобыль-Фукусіма-Астравец: ці нам гэта трэба?”. Астравецкі раённы суд адмовіўся разглядаць скаргу на той падставе, што падаўца заяўкі не заплаціў у вызначаны тэрмін дзяржаўную пошліну. Мікалай Уласевіч сцвярджае, што гэтую пошліну ён мусіў заплаціць да 26-га красавіка і зрабіў гэта менавіта 26-га красавіка. Уласевіч даводзіць, што на аплату пошліны яму далі толькі 4 дні, тры з якіх прыпалі якраз на выходныя. Калегія Гарадзенскага абласнога суду адразу заняла бок Астравецкага раённага суду. Увесь разгляд скаргі доўжыўся каля 7 хвілінаў і скончыўся прадказальным адхіленнем скаргі актывіста. Мікалай Уласевіч лічыць, што ягоныя канстытуцыйныя правы на су-

# Хроніка правапарушэнняў

((( Гарадзеншчына, травень )))

довую абарону былі парушаны, а рашэнне Астравецкіх гарвыканкаму і суду былі цалкам палітычныя.

**25 траўня** сябру Беларускага Хельсінскага Камітэту ў Гародні Святлану Рудкоўскую аштрафавалі на суму ў чатыры базавых велічыні. Адміністрацыйная справа, якую, на думку Святланы, сфабрыкаваў супраць яе начальнік Ленінскага РАУС так і не мае лагічнага завяршэння. У віну ёй выставілі нібыта прафесійныя ўпушчэнні на працы ў якасці старшыні жыллёвага кааператыву. Кіраўнік аддзелу ўнутраных спраў адміністрацыі Ленінскага раёна Гародні падпалкоўнік міліцыі Яўген Ярмантовіч, пасля разгляду матар'ялаў справы аб адміністрацыйным правапарушэнні ў дачыненні да Рудкоўскай, знайшоў у яе дзеяннях склад правапарушэння, прадугледжанага артыкулам 9.24 адміністрацыйнага кодэксу.

**27 траўня** раніцай (прыкладна каля 10.30), двое незалежных журналістаў - Ян Роман і Андрэй Фралоў - збіраліся запісаць відэаінтэрв'ю з жонкай свайго зняволенага калегі Андрэя Пачобута. На сустрэчу дамовіліся каля будынку абласной пракуратуры.

Прыкладна каля 10.40 усіх траіх затрымалі - пакуль няведама, на якой падставе - і адвялі ў будынак пракуратуры. Пратрымаўшы ў будынку каля дзвюх гадзін, іх адпусцілі. З усіх трох узялі пісьмовыя тлумачэнні.

**27 траўня.** Стала ведама прозвішча суддзі, які будзе разглядаць крымінальную справу журналіста Андрэя Пачобута – працэс будзе весці Віталь Лецка. На сёння ён займае пасаду старшыні суду Ленінскага раёну Гародні, у якім адбудзецца працэс. Пра гэта жонцы Пачобута Аксане паведаміў следчы, які вядзе справу. Нагадаем, што публіцыста і грамадскага актывіста вінавацяць адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. За нібыта абразу прэзідэнта і паклёп на яго Андрэю Пачобуту пагражае да 4 гадоў турэмнага зняволення. Дата пачатку працэсу пакуль не вызначана. Андрэй Пачобут па-ранейшаму ўтрымліваецца ў СІЗА Гродзенскай турмы.

# Беларуса не пусцілі...

Беларуса не пусцілі ў Беларусь! Сама фраза гучыць абсурдна і недарэчна.

Ну скажыце, што немца не пусцілі ў Нямеччыну. Што ангельца не пусцілі ў Англію. Пра арабаў увогуле лепш не згадваць. Там ва ўсякую мусульманскую краіну яны могуць ездзіць не толькі без візы, але нават без пашпарту. Па твару пазнаюць, абдымуць, запросяць, накормяць. Чаркі, праўда, не нальюць. Але толькі з тае прычыны, што рэлігія не дазваляе. А каб дазваляла, то і чарку налілі б.

Нашая рэлігія гэта дазваляе. Мала таго, гэта лічыцца прыкметай нашай, нацыянальнай беларускай гасціннасці. Ды ў нашай крыві, у нашых генах гэтай гасціннасці аж занадта. Мы кожнага чужака прымем. Ну а калі госць не чужак, а свой, блізкі, родны па крыві і духу, дык мы гатовыя разбіцца, каб толькі дагадзіць. У нашым беларускім менталітэце гасціннасць ёсць вышэйшай праявай чалавечнасці.

Мы чакалі яго, свайго сябра, як усе нармальныя людзі чакаюць сваіх сяброў і рыхтуюцца да сустрэчы з імі. Мы ўжо даўно не маладыя людзі. І нашае жыццё не было такім, каб здароўе прыбаўляла. Як кажуць у народзе: усе хваробы ад нерваў. А нерваў нам хапіла за жыццё. Няма ўжо таго здароўя. Няма нават на тое, каб з'есці чаго смачнага, тлустага, вострага. Адразу ціск падскочыць. Але халера з ім, тым жыццём, калі сябра да цябе прыязджае. Ды такія хвіліны - і ёсць жыццё. Кожная мінута за год лічыцца. І таму, чакаючы прыезду свайго сябра, мы ўжо за тыдзень рыхталіся. Заправілі цэлы бак паліва, бо трэба ездзіць і працаваць, распрацавалі маршруты, каб сябра не згубіў ні адной хвіліны дарэмна. Бо ён паўгады плануе, што яму трэба зрабіць.

А нашы жонкі ходзяць па крамах, і думаюць пра абавязкова беларускую кухню, якая таксама на бульбе і сале можа нас прыкончыць у кожную хвіліну, яшчэ хутчэй, чым тая гарэлка. Але халера з ім, тым жыццём. І трасца з тым здароўем. Усё з павагай і пашанай робіцца, каб беларусу ў Беларусі ўсё было па-беларуску.

Каб было ўсё так, як нас сустракаюць беларусы па той бок мяжы. Калі людзі кідаюць усе важныя справы і сустракаюць брата па духу – беларуса - з усімі элементамі нашай, беларускай гасціннасці.

А яго не пусцілі. Не пусцілі ў краіну, якой ён жыве. Не пусцілі ў асяродак, які дзякуючы такім як ён яшчэ застаецца беларускім. Палякі зрабілі для сваіх карту паляка. Добра быць палякам. Нават калі ты жывеш у Беларусі, то палякам больш выгадна быць, чым беларусам. Бо за плячамі паляка цэлая краіна стаіць. Краіна, якая ёсць сябра Еўразвязу, якая мае сваё меркаванне, свой уплыў на сусветную палітыку. Мае нармальнае разуменне разбудовы свайго грамадства. Таму і шануе кожнага паляка, які жыве на гэтай планеце. А калі той паляк па-польску гаварыць умее, то ўдвая шануе яго дзяржава польская.

Наш сябра ўмее гаварыць папольску. Але яго бяда ў тым, што ён гаворыць па-нашаму, па-беларуску. Не так як начальнік краіны. Не так як прэм'ер. Не так як беларускія памежнікі, якія ветліва, без злосці, без прэтэнзій, але не пусцілі беларуса ў Беларусь.

І як стала вядома, то ўжо некалькі беларускіх дзеячаў замежжа з розных краінаў не змаглі перасячы межы сваёй духоўнай Бацькаўшчыны, на росквіт культуры і мовы якой яны працуюць па-за яе межамі.

Не маркоцьцеся беларусы. Прыйдзе час, калі ваша духоўная Бацькаўшчына, будзе ганарыцца тым, што вы да яе належыце, і вітаць вас, калі вы будзеце прыязджаць да яе.

*Віктар Сазонаў*

# Шлях у тупік

***“Запомніце, няма такога народу, які нельга пасадзіць у Бастылію!” – павучальна-катэгарычна сцвярджаў адзін літаратурна-гістарычны персанаж. У рэальнасці скончылася ўсё тым, што французскі народ разбурыў муры той сама Бастыліі ўшчэнт. А вось прыклад з зусім недалёкай і больш блізкай нам гісторыі. Цягам 1982-1983 гадоў у Савецкім саюзе былі арыштаваны, пасаджаны ў звычайныя турмы і так званыя “псіхушкі” (нібыта лякарні, а насамрэч закрытыя ўстановы прымусовага ўтрымання з катаваннямі) каля 4 тысяч людзей, якія хоць адным словам дазволілі сабе пакрытыкаваць сацыялістычны рэжым. Гэта быў час кіравання савецкай імперыяй Юрыем Андропавым, старшынём КГБ – структуры, якую яшчэ са сталінскіх часоў сапраўды баяліся. Здавалася, што з іншадумствам скончана сама радыкальным і паспяховым чынам і зараз ужо нішто не перашкодзіць камуністам з Крамля пабудаваць сама “магутную і квітнеючую” дзяржаву ў свеце. Прайшло толькі пару гадоў і ў красавіку 1985-га ўся гэта ўяўная магутнасць абрынулася нібы картачны домік, бясслаўна рассыпалася ў пыл. Савецкі саюз сканаў у пакутах і смуродзе.***

Але гісторыя нічому не вучыць многіх. Ужо ў нашы дні, амаль праз трыццаць гадоў пасля “андропаўшчыны”, кіраўнік і ідэолаг Рэспублікі Беларусь публічна заяўляе пра вяртанне гэтай замшэлай цемрашальскай дактрыны. І словы не разыходзяцца з жыццём. Кожны грамадзянін Беларусі мусіць быць узяты пад татальны кантроль. Жорсткая дысцыпліна на працоўных месцах і паўсюдна рэгламентаваныя паводзіны ў вольны час – вось тыя кіты, на якіх павінна грунтавацца “асаблівая” мадэль развіцця нашай дзяржавы. Ды даўно ведама, што чалавек дбайна і руплівa працуе толькі ў дзвюх сітуацыях: калі ён мае законную матэрыяльную зацікаўленасць альбо калі кіруецца моцнай ідэяй. Ідэі кшталту карэйскага “чучхэ” ніяк не прыжываюцца на беларускай зямлі, якая мае ў сваёй гісторыі, як не круці, стагоддзі сярэднявечнай дэмакратыі. А гаспадарчая сістэма ў пару крызісу ўсё больш выяўляе сваю нягеглaсць і няздольнасць да пазітыўных зменаў.

Працягваецца палітычная расправа і над іншадумцамі. Суды працуюць нібы канвеер – па распрацаванай і ўжо адладжанай схеме. Нядаўні кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Андрэй Саннікаў атрымаў прысуд – 5 гадоў строгага турэмнага зняволення. Інтэлігентны чалавек, адукаваны дыпламат, разумны палітык засуджаны да маральных і фізічных пакутаў сярод сапраўдных крымінальнікаў-рэцыдывістаў. Засуджа-



ны толькі за тое, што імкнуўся рэалізаваць сваё канстытуцыйнае і выбарчае права, за тое, што законным шляхам хацеў разам з многімі іншымі змяніць сваю краіну да лепшага. Гродзенец Алесь Кіркевіч, адзін з лідараў “Маладога Фронту”, атрымаў 4 гады турмы толькі за тое, што быў на плошчы ў Мінску ў дзень выбараў і па меркаванні суддзі “магчыма нанёс адзін удар па дзвярах Дому ураду”. Прыблізна так засудзілі і засудзяць па справе аб так званых “масавых беспарадках” некалькі дзесяткаў мірных грамадзян. А можа яны хочуць пасадзіць у турмы ўсе 40 тысяч, што былі на плошчы 19 снежня, перайсці ад андропаўшчыны да сталіншчыны!? “Няма такога народу, які нельга пасадзіць…”. Уражвае, што карныя выракі выносяць пераважна жанчыны-суддзі, жанчыны, пакліканыя, здавалася б, быць маці, жонкамі, крыніцамі міласэрнасці. Але гэта ўжо асобная тэма.

Стратэгічны шлях, які абвешчаны цяпер – прамая дарога ў тупік. Гэта павінны зразумець усе праваднікі рэжыму. Ад іх зараз таксама залежыць, колькі маральных і фізічных стратаў будзе ў гэтай вайне дзяржавы з сваім народам. Выканаўцы рэпрэсій (кэгэбэшнікі, міліцыянты, пракуроры, суддзі, чыноўнікі) мусяць разумець таксама, што разгортваючы палітычны пераслед, яны непазбежна самы стануць яго ахвярамі. Толькі за іх, у адрозненне ад несправядліва і нявінна засуджаных патрыётаў Беларусі, ніхто не заступіцца і не памоліцца, іх ніхто не ўспомніць добрым словам, ніхто не захоча ім дапамагаць. Яшчэ не позна, яшчэ ёсць час схамянуцца і не ўдзельнічаць у беззаконні, не распальваць нянавісці і варожасці, не рабіць відавочнага зла, зразумець, што твораць.

*Уладзімір Хільмановіч*

# Плата ды расплата

Усе ведаюць, што за ўсё трэба плаціць. І расійскі прэм’ер Пуцін, які нядаўна наведаў Беларусь, даў ясна гэта зразумець беларускаму кіраўніцтву. ¨н прыехаў нібыта па бягучых справах постсавецкай прасторы, якая зараз мае безліч фармаванняў, ад СНД да мытнага саюзу. А чакалі расійскага прэм’ера не менш, чым як бедныя сваякі чакаюць багатага дзядзьку. Ды і не дзіва. У дзядзькі грошы ёсць. ¨сць нафта, газ, золата... Зрэшты, золата, калі верыць афіцыйным заявам, і ў самых хапае. Золатавалютны запас краіны як быццам бы яшчэ амаль што некрануты. Толькі яго на падтрыманне рубля пускаць, з пункту гледжання сённяшняй улады, недапушчальнае марнатраўства.



Fig. 21 Fig. 22

Цікава, навошта тады ён увогуле патрэбны, калі яго нікуды не пускаюць. Золата, само па сабе, для жыцця чалавека прадукт не надта абавязковы. Яго не з’ясі, не вып’еш, а калі і апранеш, то яно не асабліва грэе. Хіба толькі душу. Ці калі больш дакладна, то грэе не ўсю душу, а толькі такія яе якасці як самазадавальненне ды ганарлівасць. Ды і то не ўсім.

Для эканомікі, калі верыць школьнай праграме, золата таксама рэч не найперш патрэбная. Яшчэ Аляксандр Пушкін, якога ў беларускіх школах прымушаюць завучваць нават двоечнікаў, у “Яўгенію Анегіну”, захапляючыся сваім героем, пісаў: “...То есть умел судить о том; Как государство богатеет; И чем живет, и почему; Не нужно золота ему; Когда простой продукт имеет”.

Вось хіба ўся справа ў тым “простым прадукце”. (Шкада, што не ўсе ў школе паэзіяй захапляліся.) Тры міл’ярды Пуцін паабяцаў. Нават не з расійскага бюджэту, а з кішэні ЕурАзЭСу. Гэта яшчэ адно постсавецкае фармаванне. Нібыта агульнае, але ўсім зразумела, хто там галоўны. Галоўны вырашыў грошы ўзяць, і даць. Але што захацеў узамен? Вось дзе пытанне! Раней, калі яшчэ быў прэзідэнтам, хацеў усю Беларусь, цалкам або па частках. Зараз хіба, хоча менавіта “просты прадукт” у выглядзе “МАЗа”, “Белтрансгаза”, ды яшчэ якога-небудзь “аза”. А пасля, як зноў стане прэзідэнтам, зможа вярнуцца да ранейшых прапаноў.

Беларускі ўрад атрыманне крэдыту падае як найвялікшае дасягненне не толькі айчыннай дыпламатыі, але і эканомікі. Ці калі дакладней, то айчыннай эканамічнай мадэлі. Яна падаецца як найлепшая, толькі мае адзін дробненькі недахоп – гэтая мадэль увесь час патрабуе фінансавых уліванняў звонку. Таму і паўстае пытанне прыватызацыі, якая патрэбна ў такіх умовах хіба што толькі Расіі. І толькі расійскія алігархічныя колы атрымаюць ад гэтага зыск. А без выканання расійскіх умоваў, трохміліярдны транш можа спыніцца ў кожную хвіліну. Таму найлепшая эканамічная мадэль будзе прымаць усялякія ўмовы. Што зробіш, трэба грошы.

Праўда, іх, грошы, можна ўзяць не толькі на ўсходзе. Захад таксама гатовы даваць, і даваў. І калі верыць выказванням высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, то рабіў гэта яшчэ больш выгадна, чым Расія. Мала таго, Еўразвяз задарма падключае праверaных у фінансавых справах спецыялістаў, і дае парады пра тое, што трэба выправіць у найлепшай эканамічнай мадэлі, каб яна стала проста харошай і магла функцыянаваць без сістэматычных пазыкаў. Здавалася б, чаго больш трэба. Бяры, і карыстайся.

Нажаль, гэта стала немажлівым з тае банальнай прычыны, што ён, Еўразвяз, умовы ставіць зусім не такія, як усходняя суседка. Захаду не трэба наша краіна ні часткамі, ні цалкам. Яму трэба каб у гэтай краіне палітвязняў не было. Для пачатку. Ну і пасля пара-тройка патрабаванняў. Збольшага, пра правы чалавека. Цікава, ад чаго хутчэй сённяшняя ўлада адмовіцца, ад маёмасці, ці ад “ідэалогіі”?! Бо “судны дзень” у Беларусі цягнецца ўжо амаль што паўгода і зрабіў толькі адзін невялічкі перапынак. Па афіцыйнай версіі з-за хваробы суддзі. Скарыстаўшыся гэтым перапынкам, кіраўнік Расійскага МЗСу Лаўроў вельмі дыпламатычна патлумачыў заходнім калегам, чаму Расія, якая нібыта таксама заклапочаная станам дэмакратыі ў Беларусі, мусіць даць гэтыя тры міл’ярды. Такім чынам, усе фармальнасці выкананыя. Можа праз нейкі час у абменніках нават з’явіцца валюта. Толькі вось чым прыйдзецца за гэта расплаціцца, пакажа час.

*Віктар Сазонаў*

# *Каляндар памятных і круглых датаў Гарадзеншчыны на чэрвень 2011 году*

**1 чэрвеня**

120 гадоў таму (1891) – У Ліпнішках (Івейскі р-н) нарадзіўся Янка Францук, беларускі каталіцкі сьвятар, вязень савецкага канцлягеру.

100 гадоў таму (1911) – У в. Чамяры (Слонімскі р-н) нарадзіўся Якуб Міско, беларускі пісьменьнік, журналіст.

100 гадоў таму (1911) – У Гародні нарадзіўся Анатоль Марцінкевіч, адзін з пачынальнікаў беларускага баскетболу.

**2 чэрвеня**

85 гадоў таму (1926) – У в. Запольле (Наваградскі пав.) нарадзіўся Пятро Рашэтнік, дзеяч нацыянальнага руху, сябра СБМ, вязень ГУЛАГу. Вучыўся ў Наваградку ў гімназіі і настаўніцкай семінарыі.

**3 чэрвеня**

225 гадоў таму (1786) – У мяст. Жалудок (Шчучынскі р-н) нарадзіўся Канстанцін Тызэнгаўз, асьветнік, прыродазнавец.

**5 чэрвеня**

100 гадоў таму (1911) – У в. Копцевічы (Смургонскі р-н) нарадзіўся Адам Дасюкевіч, беларускі грамадзка-культурны дзеяч, журналіст.

**6 чэрвеня**

170 гадоў таму (1841) – У маёнтку Мількаўшчына (Гарадзенскі р-н), нарадзілася Эліза Ажэшка (дзявочае Паўлоўская, польска-беларуская пісьменьніца, удзельніца паўстаньня 1863-64.

**11 чэрвеня**

35 гадоў таму (1976) – Памёр Леанард Чарняк, беларускі рымска-каталіцкі сьвятар. Нараджэнец в. Дордзішкі (Смургонскі р-н). Вучыўся ў Ашмянах, працаваў у Эйшышках, з 1920 у Смургонях, у 1933-36 у Трабах.

**15 чэрвеня**

115 гадоў таму (1896) – У мяст. Любча (Наваградскі р-н) нарадзіўся Павал Каравайчык, беларускі культурны дзеяч, пісьменьнік.

**16 чэрвеня**

80 гадоў таму (1931) – У Вільні з-за перасьледу польскімі ўладамі застрэліўся Францішак Рамейка, беларускі каталіцкі сьвятар. У 1909-10 працаваў у Іўі.

**18 чэрвеня**

195 гадоў таму (1806) – У маёнтку Парэчча (Слонімскі р-н) нарадзіўся Міхал Валовіч, арганізатар нацыянальна-вызвольнага руху, удзельнік паўстаньня 1830-31.

100 гадоў таму (1911) – У в. Мінкі (Смургонскі р-н) нарадзіўся Аляксандар Шыдлоўскі, беларускі культурны дзеяч, кампазітар.

**19 чэрвеня**

70 гадоў таму (1941) – Дэпартацыя з тэрыторыі Заходняй Беларусі сябраў некамуністычных грамадзкіх і палітычных арганізацый.

**20 чэрвеня**

445 гадоў таму (1566) – У Грыпсхольме (Швэцыя) нарадзіўся Жыгімонт III Ваза, вялікі князь ВКЛ і кароль польскі ў 1587-1632 гг.

**21 чэрвеня**

270 гадоў таму (1741) – У Ліёне (Францыя) нарадзіўся Жан-Эмануіл Жылібэр, францускі прыродазнавец, вучоны, які працаваў у Гародні і Вільні.

**22 чэрвеня**

70 гадоў таму (1941) – Напад фашысцкай Германіі на СССР. Працяг другой сусветнай вайны на тэрыторыі Гарадзеншчыны.

**28 чэрвеня**

80 гадоў таму (1931) – У Наваградку адчынены курган Адама Міцкевіча.

30 чэрвеня

145 гадоў таму (1866) – Памёр Антон Глінскі (нар. у 1797), беларуска-польскі пісьменьнік, фальклярыст, перакладнік. Нараджэнец Шчорсаў.

РАЦЫЯ 98,1 99,2 FM

*Кожны аўторак у эфіры незалежнай радыёстанцыі “Радыё Рацыя” - праграма “Людзьмі звацца!”, якая асьвятляе падзеі, датычныя правоў чалавека на Беларусі. Час выхаду ў эфір – 15-05 (паўтор - серада 0:05-1:00 і субота 7:05-8:05). Таксама ў гэты час яе можна слухаць праз інтэрнэт на сайце*

www.racyja.com

*Праваабарончую інфармацыю па Беларусі вы можаце атрымаць на сайце*

www.spring96.org

Гарадзенскі праваабарончы інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь «Прэзумпцыя»
выходзіць 1 раз у месяц
наклад 299 асобнікаў
для нутранога карыстаньня

падрыхтаваны да друку: травень 2011
e-mail:prezumpcyja@gmail.com
распаўсюджваецца задарма
пры передруку спасылка абавязковая

